# УНІВЕРСІТЭЦКАМУ ДЫПЛОМУ —

## АРЫЕНЦІР ВЫЗНАЧАНЫ

**На сустрэчу з Уладзімірам Семяньковым мне пашанцавала. Ведала, што ён пяцікурснік філасофскага аддзялення гістарычнага факультэта. Зараз працуе над сваёй дыпломнай работай. А яго аказалася вельмі проста знайсці — у камітэце камсамола.**

ВАЛОДЗЯ СЕМЯНЬКОЎ вырашыў паступаць на філасофскае аддзяленне ў восьмым класе, хаця спачатку было тры варыянты: біялогія, спорт, філасофія. Праўда, дзякуючы іменна біялогіі Уладзіміра зацікавіла і філасофія. І выбар аказаўся беспамылковым. Сведчанне таму — не толькі выдатная вучоба, але і пэўныя вынікі ў навуковай дзейнасці.

З першага курса ён займаецца навуковай працай. Гэта не толькі доўгія гадзіны ў бібліятэцы, не толькі даклады перад таварышамі. Гэта паездкі, сустрэчы і знаёмствы са студэнтамі ўсяго Савецкага Саюза.

Першая — у Маскву, на студэнцкую канферэнцыю МДУ, потым — Батумі, Казань, Новасібірск. Асабліва запомніліся паездкі ў Казань і Новасібірск. Вясной 1984 года ён паслаў сваю работу на Усесаюзны конкурс студэнцкіх работ па грамадскіх навуках, гісторыі ВЛКСМ і міжнароднаму маладзёжнаму руху. А ў лютым 1985 паехаў у Казань на Усесаюзную канферэнцыю, дзе былі падведзены вынікі конкурсу і дзе У. Семянькоў атрымаў дыплом першай ступені.

Увесь 1985 год быў неспакойным. У красавіку ён едзе на Усесаюзную алімпіяду ў Новасібірск. Тэма яго дзесяцімінутнага даклада — «Светапогляд і фарміраванне сацыяльнага фактара». Даклад невялікі, але дыскусіі зацягнуліся на гадзіну. «Рэакцыя пасля даклада,— гаворыць Валодзя,— была бурная. На ўсе пытанні, якія цікавілі прысутных, на маю думку, адказваў ясна і пераканаўча». За што і атрымаў на алімпіядзе дыплом першай ступені. Матэрыялы даклада былі надрукаваны.

Цяпер у Валодзі самая адказная і важная з усіх напісаных работа. Ён рыхтуе дыпломную. Тэма, якую выбраў, ужо не новая для яго. «Кожны філосаф глыбока даследуе нейкую адну важную праблему. Але калі пачынаеш працаваць над ёй, адразу ўзнікае шэраг новых пытанняў, на якія трэба таксама шукаць адказы,— вось так тлумачыць Уладзімір сувязь сваіх папярэдніх работ і гэтай.— А яшчэ,— дадае,— я ніколі не пішу аб тым, што ўжо было напісана». Тэма яго дыпломнай работы: «Роля светапогляду ў сацыяльна-гістарычным пазнанні».

**Ж. МІРОНАВА.**

*ВУЧОБА — ГАЛОЎНАЯ ПРАЦА СТУДЭНТА*

## НІЯКІХ САКРЭТАЎ

**Знаёмцеся: Сяргей Геут, студэнт IV курса аддзялення філасофіі гістарычнага факультэта. У залікоўцы Сяргея выдатныя (іх больш) і добрыя адзнакі. Дзве апошнія сесіі здадзены толькі на «выдатна». А гэта не проста. Ні для каго не сакрэт, што філасофія складаная навука.**

**Удзельнічае Сяргей і ў навуковай рабоце, якую лічыць неабходнай для кожнага студэнта.**

ЦІКАВІЦЬ ЯГО МНОГАЕ. Да студэнцкай навуковай канферэнцыі ў снежні мінулага года Сяргей падрыхтаваў два даклады. Адзін з іх быў прысвечаны новай рэдакцыі Праграмы КПСС, а другі — «Маральнае развіццё асобы як вырашэнне супрацьлегласцей» — праблемам этыкі і эстэтыкі. Як прызнаецца Сяргей: «Тэма гэта даволі складаная і мала распрацавана».

Зараз Сяргея больш за ўсё цікавіць праблема чалавека, яго сучаснага аблічча, перспектыў і тэндэнцый далейшага развіцця і перамен у будучым. Гэтаму будзе прысвечана курсавая работа «Фізічнае аблічча чалавека як аб'ект эстэтычнай ацэнкі», якую Сяргей рыхтуе пад кіраўніцтвам доктара філасофскіх навук Мікалая Ігнацьевіча Крукоўскага. У рабоце Сяргей выкарыстоўвае элементы мастацкай літаратуры.

Сам Сяргей лічыць, што навуковай работай трэба займацца па меры сваіх магчымасцей. Інакш кажучы, толькі ў тым выпадку, калі студэнт упэўнены ў сваіх сілах, калі ён лічыць, што ведае дастаткова, што можа зрабіць нешта новае.

Важную ролю ў жыцці сучаснага студэнта адыгрывае грамадская работа. Не заўсёды яна проста спалучаецца з вучобай. Сяргей два гады быў старшынёй прафбюро факультэта.

Ёсць у Сяргея і такое захапленне, як спорт. Сем гадоў свайго жыцця аддаў ён гандболу. Яго лічылі перспектыўным іграком — нечаканая траўма парушыла ўсе планы. Але спортам Сяргей працягвае займацца і зараз: ён гуляе за футбольную каманду «Філосаф», створаную на базе факультэта.

Яшчэ адно захапленне — гітара. Яго гітара даверлівая. Сяргей любіць іграць рамансы, патрыятычныя песні. Калі ён бярэ гітару, яна літаральна ажывае ў яго руках...

Вось такі ён чалавек, Сяргей Геут.

**Н. БАГДАНОВІЧ.**



*РАЎНЕННЕ — НА ПРАВАФЛАНГОВЫХ!*



*НА ЗДЫМКАХ: Вольга Паўловіч і Вольга Манцэвіч, студэнткі III курса ФПМ — выдатніцы вучобы. Яны прымалі актыўны ўдзел ва Усесаюзнай алімпіядзе «Студэнт і навукова-тэхнічны прагрэс». Дзяўчаты займаюцца грамадскай дзейнасцю, яны — намеснікі сакратара камітэта камсамола факультэта.*

*Фота А. ВАЛОШЫНА.*

*ПРАПАНУЮ МЕТАД*

## Стаўка на самаадукацыю

**ЧЫМ** займаецца студэнт пасля лекцый? Самаадукацыяй? Пэўная частка іменна так і робіць. А астатнія? Беспамылкова скажу, што пераважная большасць да падручнікаў і канспектаў і не дакранаецца. І таму я прапаную метад.

Чаму б існуючую лекцыйна-сесійную сістэму не замяніць значна большай колькасцю семінарскіх і практычных заняткаў? Гэта ж ужо практыкуецца ў медыцынскіх ВНУ.

Тады, відаць, з'явіцца больш стымул для самаадукацыі. Таму што студэнта будуць выклікаць адказваць амаль кожны дзень. А час для гэтага знайсці магчыма. Належыць толькі пакінуць уводныя, праблемныя лекцыі і кансультацыі.

Яшчэ адзін нюанс. Катастрафічна не хапае літаратуры. Не толькі колькасна, але і літаратуры якаснай. Некаторыя падручнікі запруджаны тэрмінамі, фармуліроўкамі...

Да чаго прывядзе прапанаваная перабудова? Студэнт будзе рыхтавацца на працягу ўсяго семестра. І выдатнікаў стане тады значна больш, таму што ўсе студэнты — патэнцыяльныя выдатнікі.

**А. ПАЛЫНСКІ.**

*ПЫТАННЕ РУБАМ*

**СТУДЭНТА ўжо даўно спрабуюць пераканаць, што жыць па плану лепш: усё паспееш, ні пра што не забудзешся, з'явіцца шмат вольнага часу. І мне, першакурсніцы, вельмі хацелася пазнаёміцца са студэнтам, які б паказаў ідэальны распарадак дня, што стаў бы цудадзейным сродкам для дасягнення высокай мэты.**

## РАСПАРАДАК ДНЯ — ФАНТАСТЫКА?

ЦІ МОЖНА ўвогуле паспець усё — і добра вучыцца (сур'ёзна, каб сам быў задаволены сабой), і займацца спортам, мастацкай самадзейнасцю, бываць у кіно, тэатрах? Нарэшце, паспяваць у час снедаць, сустракацца з сябрамі? Ці гэта немагчыма?

Я думала, што пачую расказ, як выдатнікі адразу пасля заняткаў спяшаюцца ў бібліятэку, пасля вяртання ў інтэрнат ці дадому яшчэ раз на ноч праглядваюць канспекты лекцый і кладуцца спаць, каб раніцай быць у поўным узбраенні. Так я ўяўляла працоўны дзень выдатніка. І што высветлілася? У бібліятэку паміж сесіямі «дабіраюцца» адзінкі, а наконт канспектаў — дык гэта з вобласці фантастыкі!

Але давялося сустрэць і іншага студэнта. Усё, што ён задумвае — паспявае зрабіць. Праўда, раскладаў і планаў ён ніякіх ніколі не пісаў. Яго дзень ператварыўся ў аднастайную схему, якой ён і прытрымліваецца. Раніцай — гімнастыка, потым — заняткі ва універсітэце, пасля абедзеннага перапынку — непасрэдная работа з кнігай, перачытванне канспектаў лекцый, працяглая прагулка перад сном. Ну, а як жа вясёлыя студэнцкія вечары, шчырыя размовы з сябрамі? «Наш» студэнт усяго гэтага «шчасліва» пазбягаў». Справа ў тым, што ён не жыў у інтэрнаце.

Дык ці ж гэта выйсце?

Вы заўважылі, зразумела, што інтэрв'ю былі ананімнымі? Справа ў тым, што самі выдатнікі, з якімі давялося размаўляць (студэнты мехмата, фізфака, журфака), у большасці былі разгублены самой пастаноўкай пытання. Словы «распарадак дня» не былі звыклымі для іх. Ці ён наогул не існуе ў жыцці студэнта — распарадак дня?

Так і засталося пытанне без адказу.

**К. ВЫСОЦКАЯ.**

